# МАНЮШКА Ў СЭРЦАХ, МАНЮШКА Ў ГІСТОРЫІ

**Гэты год праходзіць пад знакам вялікага кампазітара Станіслава Манюшкі. Бо менавіта цяпер адзначаецца 200-годдзе з дня яго нараджэння — праходзяць шматлікія канцэрты, навуковыя канферэнцыі, адкрыцці памятных знакаў і многае іншае. Манюшка ў сэрцах, Манюшка ў гісторыі, яго музыка — на сцэнах. У пасольстве Літвы ў Беларусі адбылася навуковая канферэнцыя, прысвечаная гэтаму творцу, а ў мінскім касцёле Найсвяцейшай Тройцы адбыўся сумесны канцэрт беларускіх і літоўскіх музыкаў, на якім выканалі духоўныя творы кампазітара.**



**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Літвы ў Беларусі Андрус ПУЛОКАС** падзяліўся даволі прыватнымі эмоцыямі, якія звязваюць яго з кампазітарам:

— Апошнім часам ладзіцца нямала ініцыятыў, прысвечаных тым дзеячам культуры, якія нас аб'ядноўваюць. Іх творчасць радуе ўсіх. Я падумаў: «А якія ў мяне адносіны са Станіславам Манюшкам?..» Бо ў кожнага з нас абсалютна рознае стаўленне да славутых людзей. Я зразумеў, што маё дачыненне з кампазітарам адбываецца дзякуючы помнікам. Адразу прыгадваецца наш цудоўны Вільнюс, стары горад. Там, у вельмі ўтульным месцы, стаіць помнік — колькі сябе памятаю, ён быў заўсёды. Даволі стары, зроблены з цёмнага каменю. Аказалася, што гэта самы стары помнік Станіславу Манюшку, усталяваны яшчэ ў 1922 годзе. Пастамент для яго выкарыстаны ад помніка Пушкіна. (Да 1914 года ў Вільнюсе быў помнік гэтаму паэту, але з нейкай прычыны ён быў вывезены ў Расію, затое застаўся пастамент.) Гэты год у Вільнюсе быў аб'яўлены годам Манюшкі — бо значная частка жыцця кампазітара звязана з літоўскай сталіцай. І хоць на той стары помнік зазвычай не надта звяртаюць увагу, не так даўно я быў каля яго і пабачыў некалькі пакладзеных кветак... Значыць, людзі памятаюць, і гэта прыемна.

**Прафесар Віктар СКАРАБАГАТАЎ** адзначыў, што трэба, каб кожнаму слыннаму ўраджэнцу краіны быў пастаўлены помнік там, дзе ён нарадзіўся ці дзе зрабіў значны ўнёсак у яе культуру, — і тады свядомасць народа абсалютна зменіцца. А тое, што ў беларускай сталіцы нарэшце з'явіўся помнік Манюшку, пераканаы прафесар, цалкам змяніла стаўленне ў музычным асяроддзі да кампазітара, яго творчасць пачалі ўспрымаць як уласную спадчыну і шырэй уводзіць у музычны ўжытак.

— У часы Манюшкі за друкаванае беларускае слова маглі пасадзіць у турму назаўтра ж — гісторыя літаратуры, культуры гэта ведае, — дадае Скарабагатаў. — Менавіта ў такіх умовах ставілася першая опера на беларускай мове «Ідылія» («Сялянка»). Натуральна ж, адразу ў дзень абвесткі спектакль забаранілі, афішы сталі здымаць. Аднак прэм'ера ўсё ж такі адбылася, і яшчэ ў пяці гарадах таксама. Уявім сабе Манюшку, які пісаў музыку да беларускамоўнага тэксту Дуніна-Марцінкевіча, — ён што, бессвядома гэта рабіў? Ён рабіў тое абсалютна свядома. Яму Радзіма была важнейшая, чым небяспека трапіць за краты, дзе пабывалі многія іншыя дзеячы.

**Кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт Вольга САВІЦКАЯ** нагадала, што асоба Станіслава Манюшкі ў час святкавання яго 200-годдзя з'яўляецца тым сімвалам, які аб'ядноўвае творчую прастору Беларусі, Літвы і Польшчы. Нарадзіўся будучы кампазітар на Міншчыне, у маёнтку Убель, дзе назапашваўся атмасферай яркага, непаўторнага мясцовага фальклору. Станіслаў вучыўся ў Мінскай мужчынскай гімназіі і музычнай школе Дамініка Стафановіча — у гэты час пазнаёміўся і пасябраваў з многімі маладымі літаратарамі, артыстамі, музыкамі. Пакідаючы Мінск, 17-гадовы Станіслаў Манюшка ўжо цвёрда ўсведамляў сваё кампазітарскае пакліканне.

— У Мінску на гарадской сцэне ў 1834 годзе прагучала музыка Манюшкі да спектакля «Канторскія служачыя», а ў 1843 годзе — да спектакля «Латарэя», — дадае Вольга Савіцкая. — Творчае супрацоўніцтва звязала кампазітара з пачынальнікам новай беларускай літаратуры і беларускага тэатра Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам. На яго словы створаны спектаклі «Рэкруцкі набор», «Спаборніцтва музыкаў», «Чароўная вада». У 1852 годзе ў памяшканні мінскага тэатра з вялікім поспехам прайшла пастаноўка «Ідыліі» («Сялянкі»), дзе ўпершыню загучала беларуская мова.

Да завяршэння «Года Манюшкі» застаецца ўсяго пару месяцаў. Аднак па-сапраўднаму адкрыць для сябе яго творчасць, пачуць і ўбачыць на розных пляцоўках — ад вялікага тэатра оперы і балета да невялічкіх цэркваў і касцёлаў — ніколі не будзе позна.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**